# Знойдзеная пахавальная пліта Яна Баршчэўскага будзе экспанавацца ў Мінску




Фрагмент афішы выставы. Фота: nlb.by.

АВТОР
REFORM.by

ОПУБЛИКОВАНО
19:18 21.07.2021

Нядаўная адшуканая і адрэстаўраваная пахавальная пліта аўтара твору «Шляхціч Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» будзе паказана ў Мінску ў межах выставы «**Ян Баршчэўскі**, які любіў Бога, прыроду і людзей" у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

Менавіта надпіс з адшуканага надмагілля класіка і пачынальніка беларускай літаратуры была вынесена ў назву выставы. У поўным варыянце эпітафія гучыць так: *«Ян Баршчэўскі, які любіў Бога, прыроду і людзей. Пісьменнік натхнення і пачуцця. Жыў годна 70 гадоў. Памёр 28 лютага 1851 года».*

Нагадаем, што пахавальная пліта галоўнага рамантыка беларускай літаратуры была знойдзена некалькі гадоў таму ў горадзе Чуднів (Житомірская вобласць, Украіна) на ўчастку дома аднога з жыхароў. Паверхня артэфакту было моцна сапсаваная іржой, таму напачатку гаспадары не надалі ўвагі помніку. Толькі калі апошнім зацікавілася дачка гаспадароў – Алена, аб унікальнай знаходцы стала вядома сусветнай грамадкасці. Дзякуючы падтрымцы Фонду імя **Марыі Магдалены Радзівіл** 35-кілаграмовы артэфакт быў адрэстаўраваны і дастаўлены ў Беларусь на радзіму аўтара «Нарыса паўночнай Беларусі». Сёлета помнік дэманстраваўся ў музеях Віцебшчыны: Расонах, Полацку, Віцебску, а зараз прыбудзе ў Мінск.

22 ліпеня ў 16.00 у Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэцы і адкрываецца сенсацыйная выстава, на якой можна будзе пабачыць культурны артэфакт, а гэтаксама рэдкія выданні пісьменніка.

Зборнік "Шляхціч Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях" (1844–1846), альманах "Незабудка" (1840–1844) і іншыя вельмі каштоўныя выданні, – Нацыянальная бібліятэка падкрэслівае, што выстава будзе працаваць толькі тыдзень.

Варта дадаць, што ўваход у дзень адкрыцця экспазіцыі – 22 ліпеня – у Музей кнігі вольны. У астатнія дні – па чытацкім білеце або білеце сацыякультурнага цэнтра.